Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(63), 2010

*УДК 321 (07)*

# Узаемаадносіны Ватыкана і хрысціянска-дэмакратычнай партыі Італіі (1943-1962 гг.)

А. Ф. Паддубская

У артыкуле разглядаюцца адносіны каталіцкай царквы да хрысціянска-дэмакратычнай партыі: аналізуецца станаўленне ХДП Італіі; развіццё партыі на працягу акрэсленага перыяду; апісваюцца асаблівасці супрацоўніцтва ХДП Італіі і Ватыкана пасля ІІ Сусветнай вайны.

У Італіі ўжо ў ходзе вызваленчай вайны на хвалі дэмакратычнага пад'ёма пачынаецца працэс станаўлення плюралістычнай партыйна-палітычнай структуры.

Хрысціянска-дэмакратычныя партыі і рухі вядуць сваё ідэалагічнае паходжанне ад рэакцыі каталікоў Італіі, Германіі і Францыі на лібералізм, нацыяналізм і сацыялізм XIX ст. Лічыцца, што менавіта дыскусіі XIX ст. паміж клерыкальнымі і свецкімі партыямі далі штуршок развіццю хрысціянска-дэмакратычнай думкі.

Заснавальнікам першай у Еўропе хрысціянска-дэмакратычнай партыі, фармальна незалежнай ад царквы і выступаючай за сацыяльныя рэформы, стаў у 1919 г. Луіджы Стурцо, каталіцкі святар і палітычны актывіст. Народная партыя Італіі атрымала значную падтрымку на выбарах, захоўваючы папулярнасць аж да свайго вымушанага роспуску. Яна стала своеасаблівым ідэалагічным падмуркам для з'яўлення Італьянскай Хрысціянска-дэмакратычнай партыі, узнікшай неўзабаве пасля ІІ Сусветнай вайны.

Вялікую ролю ў станаўленні новай партыі адыграў Альчыдэ дэ Гасперы (1881-1954) – апошні сакратар партыі Папаляры, якая існавала да 1926 г., калі была распушчана фашысцкім урадам. Роля дэ Гасперы ў стварэнні хрысціянска-дэмакратычнай партыі і ў далейшым палітычным жыцці, па меркаванні шматлікіх даследчыкаў, была «не проста вялікай, а вельмі вялікай» [11, с. 13]. Гісторык Дональд Сассун называе дэ Гасперы «найбольш уплывовым палітычным лідэрам пасляваеннай Італіі» [13, с. 4].

Летам-восенню 1942 г. ён праводзіць шэраг нелегальных сустрэч з дзеячамі старой партыі Папаляры, а таксама з некаторымі прадстаўнікамі маладога пакалення каталіцкага руху, які сфарміраваўся падчас фашызму. І ўжо вясной-летам 1943 г. быў сфармуляваны і атрымаў распаўсюджванне праграмны дакумент пад назвай «Аднаўленчыя ідэі хрысціянскай дэмакратыі» новай хрысціянска-дэмакратычнай партыі (назву партыі – хрысціянска-дэмакратычная – прапанавалі, сыходзячы з таго, што дэмакратыя ёсць пастулат хрысціянства: «дэмакраты – таму што хрысціяне» [14, с. 198-199]).

Новая хрысціянска-дэмакратычная партыя выступала за ўсталяванне не толькі палітычнай, але і «эканамічнай» дэмакратыі. Мэтай партыі стала стварэнне ладу, заснаванага збольшага на дробнай уласнасці; ладу, дзе сяляне і працоўныя «знікнуць як клас», ператварыўшыся ў уладальнікаў зямлі ці саўдзельнікаў прадпрыемства, а буйныя зямельныя ўладальнікі будуць абмежаваны дзяржавай. У дакуменце казалася пра неабходнасць «назаўсёды знішчыць прывід беспрацоўя». Батракі і беззямельныя сяляне павінны былі атрымаць зямлю, працоўныя – атрымаць кааператыўныя дамы. Да гэтага выказваліся палажэнні, патрабуючыя правядзення аграрнай, прамысловай, фінансавай рэформаў, дэмакратызацыі палітычных структур. ХДП аб'яўляла сваёй афіцыйнай ідэалогіяй сацыяльную дактрыну каталіцкай царквы. Лад, які партыя прапанавала ўсталяваць, называўся «хрысціянскай цывілізацыяй» [1, с. 47-48].

25 ліпеня 1943 г., калі антыфашысцкія палітычныя партыі аднавілі сваю дзейнасць у якасці легітымных арганізацый, дэ Гасперы быў ужо агульнапрызнаным лідэрам ХДП. Ён здолеў аб'яднаць у новай партыі дзеячаў рознага паходжання і поглядаў. Сярод іх былі ветэраны старой партыі Папаляры – Стэфано Ячыні, Дж. Спатаро [2, с. 27]; прадстаўнікі традыцыі каталіцкага прафсаюзнага руху – Джузэппе Гранкі, Акілле Грандзі, Джузэппе Ранеллі;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

група, што ўтварылася пры Міланскім універсітэце, на чале з Пьеро Мальвесціці, Дж. Малавезі і Энрыко Фалькам. Сюды далучыліся таксама некаторыя прафесары з Міланскага каталіцкага ўніверсітэта Святога сэрца і інш. [4, с. 129].

Такім чынам, ХДП з самага пачатку прадстаўляла самыя розныя сферы каталіцкага руху. Дэ Гасперы ставіў сваёй мэтай стварэнне вакол ХДП самага шырокага кола эканамічных, сацыяльных і палітычных сіл.

10 снежня 1945 г. лідэр Хрысціянска-дэмакратычнай партыі сфарміраваў свой першы ўрад (у кабінет увайшлі прадстаўнікі 6 партый, якія выконвалі галоўную ролю ў камітэтах па вызваленню). На выбарах у Устаноўчы сход 2 чэрвеня 1946 г. хрысціянскія дэмакраты, камуністы і сацыялісты на чале з Пьетро Нэнні набралі 75% галасоў. Прыход да ўлады новага ўрада на чале з хрысціянскім дэмакратам азначаў новы этап у працэсе фарміравання дэмакратычных структур Італіі, «будаванне» краіны ў рэчышча нармальнага развіцця. 25 чэрвеня адчыніўся Устаноўчы сход, які пачаў распрацоўку новай Канстытуцыі Італіі.

Праект Канстытуцыі выпрацоўваўся ў ходзе вострых спрэчак і стаў важным пытаннем для новай ХДП. Ватыкан хвалявала пытанне пра пацверджанне Латэранскага канкардата 1929 г., і партыя дэмахрысціян, карыстаючыся падтрымкай Святога прэстола, павінна была прапанаваць варыянт прымальны для каталіцкай царквы. Тальяцці ад імя левых дэпутатаў прапанаваў наступную фармулёўку: «Дзяржава прызнае суверэнітэт каталіцкай царквы ў межах яе правапарадку. Адносіны паміж дзяржавай і каталіцкай царквой рэгулююцца адпаведнымі палажэннямі, якія ўтрымліваюцца ў канкардаце» [15, с. 18]. Дэмахрысціяне сфармулявалі дадзены артыкул Канстытуцыі: «Дзяржава і каталіцкая царква самі па сабе незалежныя і суверэнныя. Іх адносіны рэгулююцца Латэранскімі пагадненнямі. Прынятае ў двухбаковым парадку змяненне гэтых пагадненняў не патрабуе працэдуры перагляду Канстытуцыі» [3, с. 541]. Ватыканскую дыпламатыю задавольваў дэмахрысціянскі варыянт.

25 сакавіка за варыянт, прапанаваны ХДП, прагаласавала 350 дэпутатаў (супраць – 149). 5 (пазней 7) артыкул Канстытуцыі па ўзоры хрысціянскіх дэмакратаў падтрымалі, акрамя іх, лібералы і камуністы. Гэта падзея стала важнай перамогай ХДП і перамогай Ватыкану. З 1 студзеня 1948 г. Канстытуцыя ўступіла ў сілу.

Дэбаты ў Устаноўчым сходзе вакол праекта Канстытуцыі праходзілі ва ўмовах, калі палітычнае жыццё краіны ўскладнялася праблемамі пераходнага ад вайны да міру перыяду. Пасля прыняцця галоўнага закону краіны павінны былі адбыцца выбары ў першы рэспубліканскі парламент. На выбарах перамагла ХДП, набраўшы 48, 48%. З гэтага часу пачынаецца панаванне ў палітычным жыцці Італіі пазіцый хрысціянскіх дэмакратаў. Партыя перамагала на выбарах у парламент у 1953 г. (40%) і ў 1958 г. (42%), што дало падставу называць дадзены перыяд у гісторыі Італіі «эрай ХДП».

Такія пазіцыі хрысціянскіх дэмакратаў некаторыя даследчыкі і палітычныя дзеячы таго часу тлумачылі выключна палітыкай Ватыкана, якая забяспечвала моцную падтрымку гэтай партыі. Пра панаванне Святога прэстола ў палітычнай сферы М. Скоччыморро выказваўся: «У часы фашызму ў любым дэпартаменце ці канторы можна было бачыць людзей у чорных кашулях, зараз жа, у часы дэ Гасперы, можна бачыць людзей у чорных сутанах. Чорныя кашулі не зніклі – яны сталі даўжэйшымі» [8, с. 67].

Бясспрэчна, што, з'яўляючыся каталіцкай партыяй у каталіцкай краіне, ХДП карысталася матэрыяльнай і маральнай падтрымкай Ватыкана, абапіраючыся на аўтарытэт і апарат каталіцкай царквы, што дапамагала ёй захоўваць сваю масавую базу і заваёўваць галасы. Цэментуючым яе ўплыў элементам служыла каталіцкая ідэалогія і сувязь з Ватыканам была вельмі моцнай. Прыкладам могуць стаць словы Пія XII, які перад выбарамі ў парламент 1948 г. заклікаў галасаваць за хрысціянскіх дэмакратаў, падкрэсліваючы, што адмова ад удзелу ў выбарах – «смяротны грэх» [7, с. 98]. Кансістарыяльная кангрэгацыя Ватыкана 29 жніўня 1945 г. перадала ўсім італьянскім епіскапам наступную інструкцыю: «Каталікі могуць галасаваць толькі за тых кандыдатаў, у адносінах да якіх маецца перакананасць, што яны будуць паважаць і бараніць закон Божы і правы рэлігіі і царквы ў прыватным і грамадскім жыцці» [12, с. 27].

ХДП мела магчымасць апеляваць да выбаршчыкаў, абапіраючыся на іх рэлігійнае светаўспрыманне. Хуткаму ўзмацненню партыі садзейнічалі і шырока распаўсюджаныя аргані-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зацыйныя формы каталіцкай царквы: парафіі, свецкія і рэлігійныя каталіцкія арганізацыі, а таксама прафсаюзы, якія знаходзіліся пад уплывам ХДП.

Аднак моцныя пазіцыі хрысціянскіх дэмакратаў можна растлумачыць не толькі падтрымкай Ватыкана, а ў першую чаргу тым, што з-за аб'ектыўных умоў італьянскай палітычнай сістэмы і гетэрагеннасці сацыяльнай базы ХДП, яна выступала як выразнік інтарэсаў шырокіх слаёў, як партыя цэнтра, арыентаваная на шчыльнае супрацоўніцтва з рознымі сегментамі грамадства. Прынцып сыходзіў з каталіцкай сацыяльнай дактрыны і вызначаў, што ўся стратэгія павінна быць падначалена перш за ўсё задачам манеўрыравання і супрацоўніцтва розных сацыяльных груп, якія складалі масавую электаральную базу хрысціянска-дэмакратычнай партыі (тут былі прадстаўлены працоўныя і прадпрымальнікі, сяляне і, збольшага, гарадскія слаі). Выбаршчыкаў прыцягвалі да партыі, з аднаго боку, надзея на адраджэнне дэмакратыі пасля 20 гадоў фашысцкага рэжыму, а з іншага – боязь радыкалізму левых партый.

Поспех у стварэнні і дзеянні ХДП вызначаўся і іншымі абставінамі, перш за ўсё, палітычнай сітуацыяй, якая склалася ў гэты перыяд. У заснавальнікаў хрысціянска-дэмакратычнай партыі не заставалася іншай альтэрнатывы, акрамя будаўніцтва масавай партыі, што будзе дзейнічаць у межах дэмакратычнай дзяржавы.

Другім значным чыннікам было панаванне дэмахрысціянскіх партый пасля разбурэння аўтарытарных рэжымаў (перш за ўсё ў пераможаных у вайне краінах – Германіі, Аўстрыі, Італіі). Ватыкан падтрымліваў дадзеную альтэрнатыву, указваючы ў спалучэнні хрысціянства і дэмакратыі фундамент новага сацыяльна-палітычнага ладу.

Са свайго боку, у момант разбурэння фашызму прадстаўнікі буйнога бізнесу прынялі варыянт пасляваеннага будаўніцтва, бачачы ў дэмахрысціянскіх партыях адзіную сілу, якая магла бы супрацьстаяць радыкальнаму камуністычнаму руху.

Усё гэта можа служыць тлумачэннем сілы, устойлівасці існавання створанай ХДП сістэмы ўлады.

ХДП узнікла, як складаны і супярэчлівы палітычны механізм, з аднаго боку, закліка765 аб'яднаць і адлюстроўваць у свецкай палітычнай сферы інтарэсы і патрабаванні шырокага кола католікаў, а з другога – як адзіная на той момант партыя, якой палітычная эліта магла даверыць місію па палітычным, эканамічным і маральным адраджэнні краіны.

Папа Пачэллі, каментуючы станаўленне новай партыі, канстатаваў, што народы жадаюць у ўмовах дэмакратыі эфектыўна супрацоўнічаць як у будаўніцтве асобы, так і грамадства. Калі народы жадаюць жыць у ўмовах дэмакратыі, царква абавязана выкласці свае маральныя погляды на дэмакратыю. «Царква не забараняе памяркоўныя дэмакратычныя сістэмы, – казаў пантыфік, – калі яны не выступаюць супраць каталіцкай дактрыны пра паходжанне грамадскай улады» [9, p. 79].

Падтрымка Ватыкана, такім чынам, часта выконвала станоўчую ролю ў палітычнай дзейнасці партыі, аднак у той жа час кансерватыўная пазіцыя папы прыводзіла да негатыўных вынікаў для дэмахрысціян Італіі. Акрамя недаверу папы Пачэллі і спробаў стварэння альтэрнатыўнай палітычнай сілы для каталіцкага электарата, у другой палове 1950-х гг., па словах даследчыка Сандро Маджыстэра, пачынаецца «агонія цэнтрызму ХДП» [10, с. 143]. Цэнтрыскі курс, што праводзіўся партыяй разам з лібераламі з 1954 г. (калі пасля смерці дэ Гасперы на чале ўрада стаў спачатку Д. Пелла, а потым М. Шэльба), не абазначаў ніякіх прынцыповых, стратэгічных зменаў у яе палітыцы. У той жа час цэнтрысцкая кааліцыя не была дастаткова трывалай і не забяспечвала палітычнай стабільнасці.

Для некаторых дзеячаў ХДП рабілася зразумелым неабходнасць пошуку новых, нетрадыцыйных палітычных саюзнікаў і распрацоўка праграмы, якая магла б замацаваць супрацоўніцтва з імі на ўрадавым узроўні. Такая праграма павінна была адпавядаць сацыяльна-эканамічным зрухам 1950-х гг. у італьянскім грамадстве.

Найбольш пажаданым партнёрам для ХДП у такіх умовах была Італьянская сацыялістычная партыя (ІСП), якая парвала адносіны з камуністамі і сама актыўна імкнулася да ўдзелу ў урадзе. Менавіта ўдзел сацыялістаў павінен быў надаць новы характар кааліцыі. Праўда, манеўр улева – у бок ІСП – рабіўся складаным з-за пазіцыі Пія XII, які перашкаджаў збліжэнню з сацыялістамі, фармальна наклаўшы анафему на камуністаў, сацыялістаў і выбаршчыкаў, што галасавалі за тыя партыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гэта стратэгія левага цэнтру як саюз са «свецкімі» партыямі пачала ажыццяўляцца толькі з пачаткам пантыфікату Яна ХХІІІ, які змяніў памерлага Пія XII і фактычна не перашкаджаў новай стратэгіі хрысціянскіх дэмакратаў. У энцыкліцы «Pacem in terris» утрымліваліся заклікі да міру і супрацоўніцтва розных палітычных плыняў [6]. У сваю чаргу, частыя ўрадавыя крызісы значылі, што «эра» манапольнага кіравання ХДП падыходзіла да свайго завяршэння. У 1962 г. з'езд хрысціянска-дэмакратчнай партыі пацвердзіў накірунак левага цэнтру, а А. Фанфані сфарміраваў урад з прадстаўнікоў ХДП, сацыял-дэмаратаў і рэспубліканцаў.

Такім чынам, з'яўленне хрысціянска-дэмакратычнай партыі, яе рост пацвярджалі меркаванне пра «маральны аўтарытэт царквы і рэлігіі ў Італіі» дадзенага перыяду [5, с. 274]. У гэтым сэнсе ўтварэнне ХДП было падрыхтавана захаваннем не толькі арганізацыі, але і ідэалагічнай аўтаноміі каталіцкага руху ў часы фашызму. Калі лічыць, што хрысціянска-дэмакратычная партыя ў сваёй праграме аформіла настрой значнай часткі сярэдніх слаёў насельніцтва, то трэба думаць, што такія настроі скланіся не адразу, а яшчэ ў недрах фашысцкага рэжыму.

Другая палова 1950-х гг. характарызавалася неабходнасцю для ХДП пераасэнсаваць свой папярэдні вопыт і стратэгічны курс, які адпавядаў бы зрухам у грамадстве. Гэта магло адбыцца толькі пасля адыходу Ватыкана ад крытыкі камуністаў і сацыялістаў, што здарылася ў 1958 г. з прыходам Яна ХХІІІ.

**Abstract.** The article discusses the Catholic Church and the Christian Democratic Party relationship: analysis of the Italian CDP formation, the party development over a certain period, the article describes the characteristics of Italian CDP and Vatican cooperation after World War II.

**Літаратура**

1 Комолова, Н. П. Новейшая история Италии / Н. П. Комолова. – М.: Просвещение, 1970. – 319 с.

2 Комолова, Н. П. Движение Сопротивления и политическая борьба в Италии / Н. П. Комолова. – М.: Наука, 1972. – 444 с.

3 Конституции буржуазных государств Европы // Под ред. Г. С. Гурвича. – М.: Издательство иностранной литературы, 1957. – 642. с.

4 Лисовский, Ю. П. Италия от фашизма к демократии: Трудные пути послевоенной перетройки / Ю. П. Лисовский. – М.: Наука, 1990. – 385 с.

5 Лопухов, Б. Р. История фашистского режима в Италии / Б. Р. Лопухов. – М.: Наука, 1977. – 296 с.

6 Маджистер, С. Политика Ватикана и Италия 1943-1978 / С. Маджистер. – М.: Прогресс, 1982. – 254 с.

7 Рутенбурс, В. И. Ватикан в прошлом и настоящим /В. И. Рутенбурс. – Ленинград: Лениздат, 1955. – 167 с.

8 Скоччемарро, М. Новая демократия / М. Скоччемарро. – М.: Госполитиздат, 1959. – 289 с.

9 Agenda sociale. Raccolta di testi del Magistero. – Vaticano: Libreria editrice Vaticana, 2000. – 490 p.

10 Giovanni XXIII. «Pacem in terries» [Electronic resource]. – Mode of Access: http://www.vatican.va/holy_father/john_xxiii/encyclicals/documents/hf_j-xxiii_enc_11041963_pacem_it.html – Date of Access: 08. 05. 2008.

11 Chiaranti, G. La democrazia cristiana / G. Chiaranti. – Roma, 1980. – 275 p.

12 Prandi, A. Chiesa e politica / A. Prandi. – Bologna, 1968. – 374 p.

13 Sassoon Donald. Contemporary Italy: Economy, Society and Politics since 1945. – New York, 1997. – P. 4.

14 Spataro, G. I democratici cristiani dalla dittatura alla republica / G. Spataro. – Milano, 1968. – 311 p.

15 Tagliatti, c. Avanti, verso democrazia! / P. Tagliatti. – Roma, 1964. – 32 p.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 21. 01. 10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ